**Н.А. Радзіваноўская**

# *Прэфіксальныя айконімы, суадносныя з назвамі расліннага свету*

Прэфіксальныя айконімы, суадносныя з назвамі расліннага свету, на тэрыторыі Беларусі прадстаўлены адносна невялікай колькасцю. Сярод гэтых айконімаў вылучаецца дзве разнавіднасці словаўтваральнай мадэлі: 1) прэфікс + апелятыў: *Заельнік, Захвойнік;* 2) прэфікс + імя ўласнае: *Занарач* (воз. і р. Нарач), *Узнача* (р. Нача). Як сведчыць аналіз фактычнага матэрыялу, усе айконімы ўтвораны па першай мадэлі.

У межах мадэлі **прэфікс + апелятыў** намі выдзелены некалькі так званых варыянтаў мадэлі.

**Прэфікс *пад-* + апелятыў**: *Падасінка (Салігор.), Падборак (Шарк.), Падбярозы (Смарг.)* і інш. Усяго занатавана 29 айконімаў, якія з’яўляюцца назвамі 48 населеных пунктаў.

**Прэфікс *за-* + апелятыў**: *Забарок (Гарад.), Заельнікі (Віл., Іўеў.), Залозкі (Навагр.)* і інш. Усяго зафіксавана 13 айконімаў (15 населеных пунктаў).

**Прэфікс *пры-* + апелятыў**: *Прыбар (Б.-Каш., Бых., Бялын., Гом., Кір.), Прыборкі (Барыс. да 1979), Прыклёнак (Круп.).* Усяго 3 айконімы, якія з’яўляюцца назвамі 7 населеных пунктаў.

**Прэфікс *у-* + апелятыў**: *Уборак (Асіп., Барыс., Добр.), Уборкі (Б.-Каш., Лоеў., Пух., Рэч., Смал., Чэрв.).* Усяго зафіксавана 2 айконімы (9 населеных пунктаў).

**Прэфікс *на-* + апелятыў**: *Налес (Люб.).*

**Прэфікс *па-* (*по-*) + апелятыў**: *Пагай (Воран. да 1973), Повішні (Ашм.).*

Такім чынам, занатавана 50 прэфіксальных айконімаў (82 населеныя пункты). Яны складаюць каля 3% ад агульнай колькасці айконімаў, суадносных з назвамі расліннага свету. Для ўтварэння гэтых найменняў выкарыстоўваюцца прэфіксы *за-, на-, па-(по-), пад-, пры-, у-*. Найбольш прадуктыўнымі з’яўляюцца прэфіксы *за-* і *пад-*. Так, айконімы, утвораныя пры дапамозе гэтых прыставак, адпаведна складаюць 26% і 58% ад агульнай колькасці прэфіксальных найменняў. Геаграфічны аналіз сведчыць, што айконімы прэфіксальнага ўтварэння лакалізуюцца ў Мінскай і Гродзенскай абласцях, заходняй частцы Віцебскай і Магілёўскай абласцей, а таксама на ўсходзе Гомельшчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура**

1. Лемцюгова В.П. Беларуская айканімія. Лінгвістычны аналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці. – Мн.: Навука і тэхніка,1970. – 156 с.
2. Шакун Л.М. Словаўтварэнне. – Мн.: Вышэйшая школа, 1978. – 126 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ